# *ВЕРАСЕНЬ*

## У верасні – 175 год з часу заснавання (1830) дзяржаўнай установы культуры "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага"*

ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага" з'яўляецца першай публічнай бібліятэкай у Беларусі. У верасні 1830 г. на нарадзе ў Гродзенскага генерал-губернатара было прынята рашэнне аб адкрыцці ў горадзе бібліятэкі згодна з указаннем міністра ўнутраных спраў Расіі. Першым бібліятэкарам быў назначаны прэфект гімназіі, ксёндз Міхаіл Зелянко. У аснову бібліятэкі ляглі добраахвотныя ахвяраванні дваран горада – кнігі, афіцыйныя перыядычныя выданні, якія склалі больш за палову фонду бібліятэкі. Доступ у бібліятэку быў адкрыты толькі невялікай катэгорыі асоб з вышэйшых слаёў насельніцтва. Фонд папаўняўся вельмі слаба, ніякіх грашовых сродкаў ад дзяржавы не паступала. У 30–40-я гг. XIX ст. бібліятэкай карысталася ўсяго 40 чытачоў. Каб падтрымаць яе, у 1859 г. гродзенскі губернатар прапанаваў усім служачым горада 1% са свайго заробку ахвяраваць на ўтрыманне бібліятэкі. На сабраныя грошы былі выпісаны перыядычныя выданні і набыта некалькі дзесяткаў кніг. У 1865 г. Міністэрствам унутраных спраў быў зацверджаны статут бібліятэкі. Пасля рэвалюцыі, у 1920 г., аддзел народнай адукацыі прымае меры па цэнтралізацыі бібліятэчнай справы. Публічная бібліятэка аб'яднала бібліятэку мужчынскай гімназіі, бібліятэку яўрэйскага аб'яднання "Кунст", прыватныя бібліятэкі знакамітых людзей. Загадчыцай стала Соф'я Энштэйн. У 1921 г. Гродна адышоў пад Польшчу. У 1924 г. фонд бібліятэкі складаў 28 тыс. асобнікаў.

Пасля ўз'яднання Беларусі (1939) была створана камісія па аб'яднанню ўсіх бібліятэк горада, і 1 мая 1940 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё гарадской бібліятэкі для шырокага кола чытачоў. У гады Вялікай Айчыннай вайны памяшканне бібліятэкі занялі немцы, частка кніг была спалена, частку ўзяў да сябе на кватэру Чарвякоўскі Мікалай Аляксандравіч. Пасля вайны ён і пачаў аднаўляць бібліятэчны фонд і каталогі. У 1957 г. бібліятэцы было прысвоена імя Я.Ф. Карскага, заснавальніка беларускага мовазнаўства і філалогіі, нашага славутага земляка. На працягу 22 гадоў бібліятэку ўзначальваў Мельнічонак Павел Рыгоравіч. З 1976 да 1991 г. – Ушава Алена Аляксандраўна. За гэтыя гады бібліятэка стала сапраўдным метадычным цэнтрам бібліятэк вобласці і перанесла ўсе цяжкасці, звязаныя з правядзеннем цэнтралізацыі.

Сёння ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага" займае значнае месца ў сацыяльна-культурным развіцці грамадства. Яна з'яўляецца інфармацыйным, адукацыйным і культурным цэнтрам, фарміруе інфармацыйныя рэсурсы згодна з запытамі чытачоў і сацыяльна-эканамічным развіццём рэгіёна. Багаты універсальны фонд налічвае 600 тыс. экземпляраў дакумен-

---

* Матэрыял да даты падрыхтаваны ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага".

таў. Штогод бібліятэкай карыстаецца 45 тыс. чытачоў, сярод якіх – вучоныя, творчая інтэлігенцыя, спецыялісты народнай гаспадаркі, моладзь і дзеці. Ім выдаецца больш за 800 тыс. экземпляраў выданняў. Шмат увагі надаецца ўкараненню новых інфармацыйных тэхналогій, што дазволіла значна пашырыць магчымасці бібліятэкі, забяспечыць надзейнасць і аператыўнасць інфармацыі. З 1993 г. пачынаецца фарміраванне электронных інфармацыйных рэсурсаў. У 2000 г. бібліятэка атрымала грант з Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на рэалізацыю праекта “Аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў”. Камп’ютэрны парк бібліятэкі складаюць 35 машын. Ствараюцца базы даных: “Краязнаўства”, “Мастацтва”, “Аналітыка” і інш. Электронны каталог налічвае каля 200 тыс. бібліяграфічных запісаў. Бібліятэка мае выхад у Інтэрнет. Пашыраецца спектр інфармацыйных паслуг. З 2001 г. пры бібліятэцы дзейнічае публічны цэнтр прававой інфармацыі, які забяспечвае свабодны доступ карыстальнікаў да прававой інфармацыі.

Бібліятэка актыўна супрацоўнічае з грамадскімі этнакультурнымі і дзяржаўнымі арганізацыямі, творчымі ўстановамі і саюзамі. Сумесна праводзяцца міжнародныя навуковыя канферэнцыі, напрыклад: “60-годдзе заснавання Гродзенскай вобласці” (2004), “Любоў да зямлі... Любоў да людзей...” (Ажэшкаўскія чытанні, 2004), “Эпоха Стэфана Баторыя” (2003), матэрыялы якіх былі апублікаваны. Падтрымліваюцца цесныя сувязі з франка-беларускай залай інфармацыі аб сучаснай Францыі пры Пасольстве Францыі ў Рэспубліцы Беларусь, Генеральным консульствам Рэспублікі Польшча і Саюзам палякаў на Беларусі ў Гродне, Інстытутам Гётэ і Пасольствам ЗША ў Мінску. Адметная падзея для бібліятэкі адбылася ў 2004 г.: падпісаны праект аб супрацоўніцтве з публічнымі бібліятэкамі Рэспублікі Польшча (г. Беластока і г. Сувалкі).

Пры бібліятэцы працуюць 3 літаратурныя аб’яднанні. “Літаратурныя чацвяргі” – гасцёўня, якая ў 2004 г. адзначыла 20-годдзе. Літаратурны салон “У пані Элізы” дзейнічае пры мемарыяльным пакоі, прысвечаным жыццю і творчасці Э. Ажэшкі ў юнацкім філіяле абласной бібліятэкі. Усіх мясцовых паэтаў і пісьменнікаў збірае літаратурнае аб’яднанне “Нябесны знак”. Традыцыйна праводзяцца прэзентацыі новых кніг з удзелам аўтараў і сустрэчы з таленавітымі людзьмі.

Бібліятэка з’яўляецца метадычным цэнтрам для 595 публічных бібліятэк вобласці, а таксама для бібліятэк іншых сістэм і ведамстваў. Яна аказвае метадычную і практычную дапамогу, укараняе перадавы вопыт работы, займаецца навукова-даследчай дзейнасцю. У 2002 г. праведзена даследаванне “Бібліятэка. Дзеці. Кніга”, з 2003 г. сумесна з НББ – даследаванне “Цэнтральная бібліятэка як метадычны цэнтр”. Штогод выдаецца каля 20 творчых прац, сярод якіх: аналітычны матэрыял “Бібліятэкі Гродзеншчыны за ... год” з дадаткамі, штоквартальны бюлетэнь “З жыцця бібліятэк вобласці”, краязнаўчы і сусветны календары. На высокім прафесійным узроўні праводзяцца мерапрыемствы па павышэнні кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў вобласці, на якіх заўсёды прысутнічаюць прадстаўнікі органаў мясцовай улады.

Сёння ў бібліятэцы працуе творчы, высокапрафесійны калектыў. Гэтыя людзі аддаюць усе свае веды і майстэрства на карысць духоўнага развіцця і павышэння культуры грамадства, стварэння

пазітыўнага іміджу бібліятэкі і павышэння прэстыжу прафесіі бібліятэкара. У 2000 г. за значны ўклад у развіццё бібліятэчнай справы бібліятэка ўзнагароджана Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, а ў 2002 г. калектыў атрымаў Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Гродзенская абласная бібліятэка імя Я.Ф. Карскага** // Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. Мн., 1996. Т. 3. С. 122–123.

**Гродзенская** абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага, 1830–2000=Grodno Region Scientific library named after Y.F.Karski / [аўт. тэксту : Л.Мальцава і інш. ; пер. на англ. мову Г. Хэйлік ; фота А. Луцэнкі]. – Гродна : [б. в.]. 2000. – [19 с.] : іл.

**Міхальчык, С.І.** Гродзенская абласная бібліятэка імя Я.Ф. Карскага / С.І. Міхальчык // Памяць : Гродна. Мн., 1999. С. 541–545.

**Милоста, Н.Н.** Главная библиотека Гродненщины в русле культурного развития области /Н.Н. Милоста. Бібліятэчнае краязнаўства – дзейсны сродак дакументнага і бібліяграфічнага забеспячэння краязнаўчага руху Гродзеншчыны / Л.І. Турмасава // 60-летие образования Гродненской области : материалы Междунар. науч. конф. Гродно, 2004. С. 227–234.

**Мілоста, Н.М.** Першая публічная бібліятэка на Беларусі : (з гісторыі Гродзен. абл. навук. б-кі імя Я.Ф. Карскага) // История библиотечного дела и библиофильство : материалы Межгос. науч-практ. конф. Гомель, 2002. С. 18–20.

**Шчарбук, Т.М.** Першая публічная бібліятэка : (да 170-годдзя Гродзен. абл. навук. б-кі імя Я.Ф. Карскага) / Шчарбук Т.М. // Бібліяпанарама. 2000. Вып. 3. С. 47–49.

**Мальцава, Л.В.** Зберагаючы традыцыі мінулага : [інтэрв'ю з дырэктарам б-кі / запісаў В. Задаля] // Культура. 2001. 26 мая – 1 чэрв. (№ 21). С. 12.

***У верасні*** – 170 год з часу заснавання (1830) Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага // Новыя кнігі. 2000. № 1. Дадат. С. 11–13.

**Гродзенская** абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага, 1830–2000 : бібліягр. паказ. / склад. Л.І. Турмасава. – Гродна : [б. в.], 1995. – 30 с.